ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ГІСТОРЫЯ*

***HISTORY***

УДК 930.2:003.71(476) Паступіў у рэдакцыю 12.06.2025
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-3-204-217 Received 12.06.2025

**І. Л. Калечыц**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# СТАТУС, ПАСАДА, ТЫТУЛ, ПРАФЕСІЯ Ў НАДПІСАХ-ГРАФІЦІ ПОЛАЦКАЙ СПАСА-ПРААБРАЖЭНСКАЙ ЦАРКВЫ

**Аннотация.** Граффити как эпиграфические памятники дают информацию об истории существования письменности, просопографии, ономастики. Современные методы исследования граффити дают возможность проанализировать, какие социальные показатели чаще всего находили отражение в надписях. В статье рассматриваются различные граффити на стенах полоцкой Спасо-Преображенской церкви, дающие представление о том, какое положение занимал их автор в обществе в период средневековья и нового времени (указываются его сан, должность, звание, профессия и даже временная должность, которую он получил во время учебы). Единственным критерием, определяющим источник для исследования, было дополнение к имени, размещенное в надписи, которое указывало на должность человека, его титул, род занятий. В монашеский период в граффити чаще всего упоминаются священники, реже настоятельницы, дьяконы и пономари. Существуют упоминания об архимандритах, митрополитах, епископах, монахах и монахинях. Из профессий упоминается только иконописец в связи со смертью его жены. В иезуитский период упоминаются четыре профессии: врач, солдат, коморник и ювелир. В некоторых надписях есть упоминание об ордене иезуитов. Анализ такого рода дополнений к именам показывает, что авторов больше интересовали локальная жизнь и события, происходившие в городе.

**Ключевые слова:** Полоцк, полоцкая Спасо-Преображенская церковь, граффити, сан, должность, профессия, звание, статус, XII–XVII вв.

**Для цитирования:** Калечыц, І. Л. Статус, пасада, тытул, прафесія ў надпісах-графіці полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы / І. Л. Калечыц // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2025. – Т. 70, № 3. – С. 204–217. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-3-204-217

**Ina L. Kalechyc**

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## STATUS, POSITION, TITLE, PROFESSION IN THE GRAFFITI OF THE SAVIOR CHURCH OF POLOTSK

**Abstract.** Self-realization in society is important for the individual. A person can manifest himself in different areas of life. The article combines various indicators of who a person was in society: rank, position, title, profession, and even a temporary position that he received during his studies. The only criterion is the addition to the name, which is in the inscription. She points to his position, title, occupation. In the monastic period, priests are mentioned most of all in graffiti, less – abbots, deacons, sexton. There are mentions of archimandrites, metropolitans, bishops, monks and nuns. Of the professions, an icon painter is mentioned in connection with the death of his wife. In the Jesuit period, four professions are mentioned: doctor, soldier, komornik, jeweller. In some inscriptions there is a reference to the Jesuit order. An analysis of such additions to names shows that the authors of the inscriptions were more interested in the local life that took place in the city.

**Keywords:** Polotsk, Savior church of Polotsk, graffiti, rank, position, profession, title, status, XII–XVII centuries

**For citation:** Kalechyc I. L. Status, position, title, profession in the graffiti of the Savior church of Polotsk. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2025, vol. 70, no. 3, pp. 204–217 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-3-204-217

© Калечыц І. Л., 2025

**Уводзіны.** Графіці як эпіграфічныя помнікі даюць шмат інфармацыі па гісторыі існавання пісьменнасці, прасапаграфіі, анамастыцы. Наколькі магчыма выкарыстанне такога кшталту надпісаў пры вывучэнні прафесій, пасад, тытулаў, якія існавалі ў сярэдневякоўі і новым часе? Дагэтуль сукупнасць графіці не разглядалася ў якасці крыніцы для вывучэння такога паказчыка, як статус, прафесія або пасада чалавека. Сучасныя метады даследавання графіці дазваляюць прааналізаваць, якія сацыяльныя паказчыкі часцей знаходзілі адлюстраванне ў надпісах.

**Асноўная частка.** Для кожнага чалавека рэалізацыя ў соцыуме – вельмі важная справа. Перыяд сярэдневякоўя і новага часу не з'яўляецца выключэннем. Пры вывучэнні такіх пісьмовых помнікаў, як графіці, здаецца, што найважнейшым і неабходным у надпісе было імя. Асабліва гэта датычылася памінальных графіці і надпісаў-аўтографаў, у якіх імя чалавека сустракаецца абавязкова. Аднак шэраг надпісаў дэманструе іншае. Не толькі ў надпісах-аўтографах, але і ў памінальных запісах сустракаецца згадванне сану, пасады, тытула, які чалавек меў пры жыцці. Наколькі была распаўсюджана гэтая з'ява і як змянялася традыцыя ўключэння гэтай інфармацыі ў надпіс з цягам часу? Адказ на гэтыя пытанні можна атрымаць, калі прааналізаваць, хто і калі ўзгадваўся ў надпісах царквы.

Што датычыцца нанясення графіці на сцены полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы, то трэба адзначыць, што яны пачынаюць з'яўляцца яшчэ ў час будаўніцтва. Намі было вылучана пяць перыядаў нанясення надпісаў, у аснове якіх ляжыць спалучэнне храналагічнага прынцыпу і пануючага выкарыстання аднаго з відаў літарнай пісьменнасці ў гэты час:

1) *манастырскі перыяд* вылучаецца ад моманту пабудовы храма ў XII ст. да перыяду ваенных дзеянняў, звязаных з захопам Полацка войскамі Івана Жахлівага. Адзначаецца выключнае выкарыстанне кірыліцы для апісання падзей мясцовага, у асноўным царкоўнага жыцця;

2) *перыяд воінаў і наёмнікаў* (1578–1584 гг.) характарызуецца з'яўленнем датаваных аўтографаў на лацініцы, якія былі пакінуты людзьмі, у асноўным немясцовага паходжання;

3) *езуіцкі перыяд* (1584–1656 і 1667–1820 гг.) звязаны з перадачай манастыра ордэну езуітаў; вылучаецца з'яўленнем вялізарнай колькасці аўтографаў, у пераважнай большасці – на лацініцы. Надпісы пакінулі ў асноўным мясцовыя жыхары;

4) *перыяд пераасвячэння* (1656–1667 гг.) вылучаецца ў сувязі з пераасвячэннем царквы ў праваслаўную Спаса-Праабражэнскую падчас захопу Полацка войскамі цара Аляксея Міхайлавіча. Графіці гэтага перыяду прадстаўлены датаванымі аўтографамі, малітоўнымі надпісамі і памінальнымі запісамі на лацініцы;

5) *перыяд аднаўлення* (1820 г. і да нашага часу) абумоўлены перадачай царквы некалькімі ўладальнікамі з наступнымі рамонтамі і роспісамі. Графіці гэтага перыяду – аўтографы на лацініцы і кірыліцы.

Найбольшую колькасць надпісаў з узгадваннем пасады, сану або прафесіі людзі пакінулі ў манастырскі і езуіцкі перыяды. Першы, манастырскі перыяд, адрозніваецца найбольшай колькасцю ўзгадванняў такіх дадаткаў да імя. Сярод іх пераважная колькасць адлюстроўвае рэаліі царкоўнага жыцця (табліца).

Часцей за ўсё ў надпісах, якія змяшчаюць дадатак да імя, згадваюцца святары («поп», « іерэй»). Пяць такіх графіці памінальныя. Большасць з іх прадрапана на паўночна-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы, гэтыя надпісы можна датаваць часам да XV ст. Тут згадваюцца святары Местька, Маісей Стаўроў, Іерэмія, Мончык (Майсей?) і Іван [1]. У некаторых графіці акрамя слова «поп» ужываюцца словы «благаверны айцец мой», указваецца, што яны служылі ў «Святым Спасе». «Благаверны» – гэта значыць «набожны». Такія словы ў графіці пішуцца таксама і ў дачыненні да жанчын. «Айцец», хутчэй за ўсё, духоўны айцец манахіні або кліpaшаніна, якія пакінулі тут памінальныя запісы. Яшчэ адзін памінальны запіс, у якім згадваецца святар, ёсць на паўднёва-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: «[1]|[...] Василеи Проко[пич] [2]| Сто҃ [Спас]а попъ на пам[ять] [3]| стго [...]опа[...]». Графіта фрагментарнае, аднак у ім добра чытаюцца словы «поп Васілей Пракопіч, Святога Спаса поп» (мал. 1). Надпіс датуецца XIII ст. Ля гэтага слупа знаходзіўся кліpac, што пацверджана графіці «крылас Святога Спаса», запісанымі двойчы [2]. Два памінальныя запісы са словам «поп» знаходзяцца ў дыяканніку. Такім чынам, атрымліваюцца цікавыя суадносіны: па «прафесійнай» прыкмеце непасрэдна ў алтары,

**Размяшчэнне розных катэгорый надпісаў у полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве ў манастырскі перыяд**

**The location of various categories of inscriptions in the Polotsk Church of the Transfiguration of the Savior during the monastic period**

| Сан, тытул, пасада, прафесія | Колькасць надпісаў | Катэгорыя надпісаў, датаванне | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | памінальныя | аўтограф | ацэнка і крытыка | малітоўнае прашэнне | недакладнае |
| Мітрапаліт | 1 | 1 – алтар, XVI ст. | | | | |
| Архіепіскап | 2 | 2 – алтар, XVI ст. | | | | |
| Епіскап («уладыка») | 1 | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. | | | | |
| Ігуменя | 5 | 2 –ахвярнік, XII ст.; 1 – алтар, XV ст.; 2 – паўночна-ўсходні слуп, XIV– XV стст. | | | | |
| Ігумен | 1 | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. | | | | |
| Архімандрыт | 2 | 1 – алтар, XV ст. | | | 1 – паўднёвы ўваход, XIV ст. | |
| Намеснік ігуменні | 1 | 1 – алтар, XV ст. | | | | |
| Святар («поп», «іерэй») | 13 | 2 – дыяканнік XII–XIII стст.; 5 – паўночна-ўсходні слуп, XII–XIII стст.; 1 – паўднёва-ўсходні слуп, XIII ст. | 1 – алтар, XV ст. | 1 – дыяканнік, XIII ст.; 1 – паўднёва-ўсходні слуп, XIV ст. | 1 – паўднёвы кампартымент, XV ст.; 1 – алтар, XV ст. | |
| Дыякан | 4 | | 1 – паўднёва-ўсходні слуп, XV ст. | 2 – хоры, XV ст. | 1 – паўднёва-ўсходні слуп, XV ст. | |
| Панамар | 4 | | | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. | 1 – паўднёвы кампартымент, XV ст.; 2 – алтар, XIV ст. | |
| Чарніца | 1 | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIII–XIV стст. | | | | |
| Інак, манах | 3 | | 2 – алтар, XVI ст.; 1 – паўночна-ўсходні слуп, XVI ст. | | | |
| Кліpашанін | 1 | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. | | | | |
| Кароль | 2 | 1 – алтар, XV ст. | | | | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. |
| Вялікая княгіня | 1 | 1 – паўночна-ўсходні слуп, XIV ст. | | | | |
| Баяры | 1 | 1 – алтар, XV ст. | | | | |
| Іканапісец («писец иконный») | 1 | 1 – ахвярнік, XIII ст. | | | | |

дзе знаходзілася святарства і было больш магчымасцей пакінуць надпіс, графіці менш, чым у астатняй прасторы царквы.

Аднойчы ў алтары сустракаецца надпіс-аўтограф, які чытаецца як «Ян Маркянавіч поп» [3, с. 237]. Графіта выканана самім аўтарам і датуецца XV ст. Таксама прысутнічаюць ацэначныя надпісы. Адзін з іх знаходзіцца ў дыяканніку і датуецца XIII ст. У ім прапануецца пабіць папа Спірыда пугамі за тое, што ён з’еў «праскуры адзін канун» [4, с. 139–140]. Другі надпіс чытаецца як «Спірыд – поп добры», ён знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы і датуецца XIV ст. [5].



Мал. 1. Графіта пра прастаўленне (смерць) папа Святога Спаса Васілея Пракопіча.
Паўднёва-ўсходняя грань паўднёва-ўсходняга слупа

Fig. 1. Graffiti about the installation (death) of Pope St. Saviour Vasily Prokopych.
South-eastern face of the south-eastern pillar

Малітоўныя прашэнні святароў сустракаюцца ў паўднёвым кампартыменце полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы (графіта папа Іаана Баярусавіча Андрэевіча, якое датуецца XV ст. [6, с. 58]) і ў алтары (графіта іерэя Івана, якое датуецца XV ст. [3, с. 218]). Такім чынам, надпісы, у якіх ёсць згадкі пра святароў, часцей за ўсё знаходзяцца не ў алтарнай частцы, і гэта памінальныя або ацэначныя запісы. У сакральных частках храма, алтары і паўднёвым кампартыменце, змяшчаюцца малітоўныя надпісы саміх святароў.

Пяць разоў у манастырскі перыяд згадваюцца ігуменні манастыра Святога Спаса: Кацярына, Ганна, Акуліна. У двух надпісах імёны не захаваліся. Усе запісы такога кшталту – памінальныя. Два з іх знаходзяцца ў ахвярніку, адзін – у алтары і два – на паўночна-ўсходнім слупе [7]. Графіці датуюцца XII–XVI стст., што сведчыць пра ўстойлівую традыцыю нанясення такіх надпісаў.

Чатыры разы ў гэты перыяд у XV ст. сустракаецца згадванне дыяканаў. У двух з гэтых надпісаў дыяканы пішуць самі пра сябе. На паўднёва-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы Мікіта дыякан пачаў са свайго імя шэраг урыўкаў з тэкстаў набажэнстваў: «[1]|Микит҃ диякон҃ [2]| О тебе радуетс҃я [3]| непорочная Дв҃о» – «Мікіта дыякан. Пра цябе радуецца Беззаганная Дзева» (мал. 2). На тым жа слупе ёсць запіс дыякана Аляксандра, які засведчыў, што маліўся тут Богу: «раб҃ Бжи҃и дьякон҃ Ѡлександр молится Гд҃у Бг҃у» – «раб Божы дыякан Олександр моліцца Госпаду Богу» (мал. 3). А вось на хорах згадванне дыякана суправаджаецца негатыўным падтэкстам. У першым выпадку слова «дыякан» тлумачыць гумарыстычны малюнак, на якім ёсць выява дыякана – зверху, а унізе – чалавека, які цягне да яго рукі. Малюнак перакрэслены (мал. 4). У другім выпадку слова «дыякан» знаходзіцца ў выглядзе пажадання: «Дыякану Алешку пес на шыю» (мал. 5).

Панамары згадваюцца ў манастырскі перыяд у чатырох графіці. Два з іх – малітоўныя прашэнні, якія, па ўсёй верагоднасці, пакінулі ў XIV ст. самі панамары: Осія і Саўка [3, с. 241]. Графіці знаходзяцца ў алтары. Яшчэ адно малітоўнае прашэнне прадрапаў на сцяне Фёдар, аднак ён не служыў у полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве, а быў панамаром «Святога Сахвея», г. зн. служыў у Сафійскім саборы ў XV ст. [6, с. 64]. Панамар Святога Спаса Саўка ўзгадваецца кімсьці ў графіта на паўночна-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы, у надпісе заўважаецца, што «а Саўка, панамар Святога Спаса, служыць чэраву, працуе целу» [8]. Надпіс быў старанна задрапаны і адноўлены па верхніх і ніжніх частках літар.



Мал. 2. Аўтограф дыякана Мікіты і частка тэксту малітвы. Паўночна-заходняя грань паўднёва-ўсходняга слупа

Fig. 2. Deacon Nikita's autograph and part of the text of the prayer. Northwestern face of the southeastern pillar



Мал. 3. Аўтограф дыякана Аляксандра. Усходняя грань паўднёва-ўсходняга слупа

Fig. 3. Autograph of Deacon Alexander. Eastern face of the southeastern pillar



Мал. 4. Выява дыякана і подпіс да яе. Усходняя сцяна, хор

Fig. 4. Image of a deacon and its caption. East wall, choir



Мал. 5. Пажаданне «Дыякану Олешку пес на шыю». Усходняя сцяна, хор

Fig. 5. Wish «A dog on the neck of Deacon Oleshka». East wall, choir

Словы «інак», «манах» сустракаюцца ў надпісах тры разы і датуюцца XVI ст. Адно з графіці, верагодна, недапісанае, знаходзіцца на паўднёва-ўсходнім слупе і змяшчае толькі адно слова – «манах» (мал. 6). Два другіх ёсць у алтары. Яны абодва прадрапаны самімі манахамі. У адным запісана: «Пімін інак», да адметнасцей надпісу належаць замена кірылічнай «п» на лацінскую «р», а таксама прыпіска іншага чалавека да гэтага аўтографа «нёс ерасі» (мал. 7). Другі надпіс – пакаянны: «Грішны манах Сілуян» (мал. 8).

Двойчы ў графіці манастырскага перыяду згадваюцца архімандрыты. Адзін з надпісаў – памінальны, ён знаходзіцца ў алтары і ў ім запісаны архімандрыт Дыянісій [3, с. 224]. Другі надпіс пакінуў сам архімандрыт на сцяне на заходнім адхоне паўднёвага ўваходу ў храм. Гэтае графіта – малітоўнае прашэнне, але змяшчае яно і пакаянную частку, дапісаную зверху, дзе архімандрыт Іаван прызнаецца ў грасе п’янства. Надпіс цікавы, у прыватнасці, тым, што «Іован», як ён сябе



Мал. 6. Графіта «манах». Заходняя грань паўднёва-ўсходняга слупа
Fig. 6. «Monk» graffiti. Western face of the southeastern pillar



Мал. 7. Аўтограф інака Піміна з прыпіскай. Паўночная сцяна алтара
Fig. 7. Autograph of monk Pimin with a postscript. North wall of the altar



Мал. 8. Аўтограф манаха Сілуяна. Паўночная сцяна алтара
Fig. 8. Autograph of the Monk Silouan. North wall of the altar

называе, з’яўляецца «анхімадретам Гарадзечкім», г. зн. архімандрытам гродзенскага манастыра Святога Міхаіла, вядомага і па іншых пісьмовых крыніцах [8].

Двойчы ў алтарных графіці згадваюцца архіепіскапы. Гэта Ефімій і Нафанаіл [3, с. 232–233]. За абодвух чыталіся малітвы, аб чым сведчаць рысачкі, прадрапаныя побач з імёнамі. Маюцца на ўвазе Ефімій Акушковіч-Боскі, які быў архіепіскапам з 1504 па 1512 г. і архіепіскап полацкі Нафанаіл, які займаў гэтую пасаду з 1524 па 1533 г.

Адзін раз у такім жа памінальным запісе, які суправаджаецца рысачкамі, што адпавядаюць колькасці прачытаных малітваў, сустракаецца імя Іосіфа (Русіна), які з 1516 па 1522 г. з’яўляўся полацкім архіепіскапам, а з 1523 г. быў уведзены ў сан мітрапаліта кіеўскага. У графіці ён згадваецца менавіта як мітрапаліт [3, с. 233].

Епіскап Афанасій згадваецца ў адным памінальным запісе на паўночна-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы [11, с. 87]. Графіта датуецца па палеаграфічных прыкметах XIV ст., але такі епіскап невядомы па іншых пісьмовых крыніцах. На тым жа слупе ёсць памінальны запіс пра смерць ігумена Гаўрылы, там жа запісана і тое, што калісьці ён з’яўляўся клірашанінам Святога Спаса [11, с. 87]. Таксама адзін раз у памінальным запісе на сцяне алтара згадваецца намеснік ігуменні Антоней [3, с. 234]. Памінальны запіс пра чарніцу Фядоссю, які чытаецца так: «месяца ... 24 (дзень) преставіся чарніца Федосія на памяць святога...» і датуецца XIII–XIV стст., ёсць на паўночна-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы (мал. 9).

Тытулы, якія не маюць дачынення да царквы, таксама прысутнічаюць у графіці. Так, надпіс пра смерць караля Казіміра і прыезд яго сына ў Полацк ёсць у алтары [3, с. 222]. Фрагментарны надпіс, які змяшчае згадванне пра караля, знаходзіцца на паўночна-ўсходнім слупе, але частка яго згублена, таму аднавіць сэнс графіта не ўяўляецца магчымым. Ён чытаецца як «[1]| въ з̃ д̃нь [2]| рабъ Б̃жи [3]| п/ъ [4]| мы оу короля» – «в 7 день (преставился) раб Божы ...п ...мы у короля» (мал. 10) і датуецца XIV ст. Вялікая княгіня Улляна Цвярская згадваецца ў памінальным графіта на паўночна-ўсходнім слупе [10]. Полацкія баяры Астафій і Зіновій Васільевічы Корсакі – у памінальным запісе ў алтары [3, с. 222].

Толькі адзін раз у графіці манастырскага перыяду згадваецца прафесія – «іканапісец», а дакладна, «пісец іконны» і тое ўскосна, паколькі гэта памінальны запіс пра смерць ягонай жонкі. Графіта датуецца XIII ст. [3, с. 217].

У перыяд пераасвячэння полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы (1656–1667 гг.) існуе толькі два надпісы, дзе зафіксаваны сан, і абодва яны, на наш погляд, датычацца асобы Каліста Дарафеевіча-Рытарайскага, полацкага епіскапа, які займаў гэту пасаду з 1656 па 1662 г., з чыім імем звязваюць разбурэнне езуіцкага касцёла. Магчыма, што і на тэрыторыі рэзідэнцыі езуіцкага ордэна, куды ўваходзіла полацкая Спаса-Праабражэнская царква, маглі адбывацца нейкія «актыўныя



Мал. 9. Графіта аб прастаўленні чарніцы Феадосіі. Усходняя грань паўночна-ўсходняга слупа

Fig. 9. Graffiti about the installation of the Feodosia blueberry. Eastern face of the northeastern pillar



Мал. 10. Памінальны запіс. Заходняя грань паўночна-ўсходняга слупа
Fig. 10. Memorial inscription. Western face of the northeastern pillar

падзеі», звязаныя з асобай Каліста. Першае графіта знаходзіцца ў алтары і чытаецца так: «У 1657 годзе свяшчэннаінак Каліст здзяйсняў тут разню» [9, с. 31–32]. Апошняе слова можа трактавацца і як «выразанне, прадрапванне», і як нейкае фізічнае вынішчэнне кагосьці. Другое графіта запісана лацініцай і чытаецца наступным чынам: «На сім месцы 21 верасня 1659 з праасвяшчэнным яго міласцю айцом архіепіскапам полацкім» [12]. Каліст Рытарайскі якраз становіцца полацкім епіскапам у 1657 г. і памірае ў 1662 г. Таму падаецца слушным, што абодва гэтыя надпісы звязаны з дзейнасцю Каліста ў якасці архіепіскапа.

У наступныя перыяды надпісаў, якія ўказваюць на род заняткаў, не звязаных з духоўным жыццём, выяўлена больш. Побач з аўтографамі згадваюцца чатыры прафесіі: каморнік, жаўнер, лекар, залатар. Прычым надпісы знаходзяцца ў такіх месцах, якія раней былі недасягальнымі.

Каморнік Адам Оглечкі пакідае надпіс на лацініцы у алтары ў 1579 г., калі ў Полацк прыходзяць войскі Стэфана Баторыя, жаўнер Кімкевіч таксама піша лацініцай у алтары, даты каля яго аўтографа няма, але, па палеаграфічных даных, надпіс таксама можна датаваць канцом XVI ст. (мал. 11).



Мал. 11. Аўтограф жаўнера Кімкевіча. Усходняя сцяна праходу паміж алтаром і ахвярнікам
Fig. 11. Autograph of soldier Kimkevich. Eastern wall of the aisle between the altar and the altarpiece



Мал. 12. Аўтограф Гурiна Левоноча і лекара пана Ляшчынскага. Паўночная сцяна балкона

Fig. 12. Autograph of Gurin Levonoch and the doctor Mr. Leszczynski. North wall of the balcony

Да езуіцкага перыяду належаць наступныя графіці. Залатар Васка Ігнатавіч Праўда ў XVII ст. прадрапвае кірылічны аўтограф у паўднёвым кампартыменце, які ў манастырскі перыяд выконваў ролю маленькага храма і не быў даступным для ўсіх [6, с. 89]. Лекар «пане Ляшчынскі» таксама на кірыліцы пакідае свой аўтограф двойчы на балконе, які быў вылучаны з хор у прастору царквы з пачатку і да 80-х гг. XVII ст. (мал. 12).

Ускосна на занятак бацькі ўказвае шматсастаўнае жаночае імя Апалоніі Цэханавецкай, дзе ў групе імён бацькі ёсць словы «ваяводжанка Мсціслаўская і Суражская» [6, с. 93]. Гэтае графіта запісана лацінiцай самой жанчынай у паўднёвым кампартыменце ў канцы XVII ст. Неразборлівае прозвішча, напісанае лацінiцай, суправаджае слова «фундатар», запісанае ў праходзе паміж алтаром і дыяканнікам. А вось з усёй разнастайнай групы кірылічных надпісаў і малюнка Галгофы, зробленых Цімафеем Міхайлоўскім, якія ён пакінуў у пачатку XVII ст., толькі адно графіта суправаджаецца прыпіскай «манах». У некаторых графіці, як і ў аўтографе лекара Ляшчынскага, сустракаецца слова «пан». На высокі статус аўтараў графіці ўказваюць і гербавыя выявы: Ляліва, Ружа, Селява, Абданк, якія прадрапаны побач з імёнамі і прозвішчамі.

Нягледзячы на тое, што ў графіці сустракаецца пэўная колькасць аўтографаў чальцоў полацкага магістрата, няма ніводнага графіці, у якім была б адлюстравана пасада. Магчыма, гэта звязана з тым, што людзі пакідалі надпісы падчас навучання ў езуіцкім калегіуме.

У трох надпісах згадваюцца езуіты – «езавіты». Напрыклад, «езовіто Самуілло» ў алтары, фрагментарныя надпісы аб дзеяннях езуітаў у паўднёвым кампартыменце і на паўднёва-ўсходнім слупе полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. Ускосна прыналежнасць да ордэна вызначаецца літарамі «SI» або словамі «Soc Jezu», якія знаходзяцца побач з імем і прозвішчам.

На цікавую часовую пасаду ўказваюць тры надпісы, выкананыя шкалярамі, якія атрымалі званне «аўдытара» за паспяховую вучобу і маглі правяраць дамашнюю работу ў аднакласнікаў. Філіп Азаровіч атрымаў званне аўдытара паэтыкі і пакінуў запіс аб гэтым у алтары і на паўночна-заходнім слупе (мал. 13, 14). Лаўрэнцій Кавальскі прадрапаў у дыяканніку, што з’яўляецца «auditor eloquentia» – «аўдытарам красамоўя, рыторыкі» (мал. 15).

Магчыма, такая ж ацэначная пасада прадрапана каля некаторых імёнаў. Вядома, што за непаспяховае навучанне вучні атрымлівалі мянушку «Блазень» і «Каўпак блазня», што суправаджалася



Мал. 13. Аўтограф Філіпа Азаровіча. Паўночная сцяна алтара
Fig. 13. Autograph of Filip Azarovich. North wall of the altar



Мал. 14. Аўтограф Філіпа Азаровіча. Заходняя сцяна паўночна-заходняга слупа
Fig. 14. Autograph of Filip Azarovich. West wall of the northwestern pillar






Мал. 15. Аўтограф Лаўрэнція Кавальскага. Паўднёвая сцяна дыяканніка

Fig. 15. Autograph of Lawrence Kowalski. South wall of the deaconry

словамі: «Блазень з блазняў на векі вякоў». Аднак, магчыма, гэта проста зневажальная прыпіска каля аўтографа. Яна ў храме сустракаецца каля аўтографаў тройчы [13, с. 20].

Неабходна адзначыць, што паказчыкі таго, якое месца займае чалавек у соцыуме, адрозніваюцца ў адпаведнасці з часам нанясення надпісаў. Прычым самастойна гэтыя паказчыкі запісваюцца толькі ў перыяд, калі ваявалі воіны і наёмнікі, а таксама ў езуіцкі перыяд. У перыяд пераасвячэння сан згадваецца іншымі людзьмі.

У манастырскі перыяд сан, тытул або пасада запісваюцца самастойна толькі ў малітоўных прашэннях і адзінкавых аўтографах. Памінальныя графіці, напісаныя пра іншых людзей, узгадваюць іх сан, тытул або пасаду і, магчыма, звязаны з традыцыяй памінання ў малітвах: «архіяпіскапаў і япіскапаў, увесь святарскі і манаскі чын... і ўсіх праваслаўных хрысціян». Іншымі людзьмі пакінуты і «ацэначныя» надпісы, з крытыкай або ўсхваленнем чалавека. Яны таксама згадваюць месца, якое ён займае ў грамадстве. У гэтым выпадку было важна падкрэсліць, што чалавек дрэнна або добра выконвае свае абавязкі.

**Высновы.** Такім чынам, часцей за ўсё ў графіці ўзгадваюцца святары. Прычым большасць графіці пакінута не ў алтарнай частцы, а на слупах царквы, дзе надпісы маглі прадрапаць клірашане, манахіні або прыхаджане. Надзвычай мала, толькі адзін раз, згадваюцца манахіні (чарніцы), хаця яны з’яўляюцца асноўным «кантынгентам» тых, хто моліцца ў храме. Гэта, відавочна, звязана з тым, што жанчыны, надпісы пра якіх сустракаюцца ў царкве, «па змоўчанні» манахіні. Прыблізна роўна размяркоўваюцца надпісы з узгадваннем дыяканаў і панамароў, прычым пішуць яны адзін пра аднаго і пра сябе. У той жа час ігуменні згадваюцца толькі ў памінальных запісах. Здаецца слушным, што аўтараў цікавілі рэаліі жыцця, якія існавалі побач: святары, якія служылі ў манастыры, ігуменні, якія яго ўзначальвалі. Нават інфармацыя пра смерць караля падаецца ў сувязі з прыездам яго сына ў Полацк.

Зразумела, што ў езуіцкі перыяд царкоўныя саны і пасады знікаюць з графіці. Аднак цікава, што гэты перыяд, які характарызуецца большай свабодай ў нанясенні надпісаў, змяшчае меншую колькасць згадвання прафесій і пасад. Верагодна, гэта звязана з тым, што большасць надпісаў

у храме пакінулі, ўсё ж такі, шкаляры. Магчыма, прыналежнасць да пэўнай групы людзей у новы час стала адыгрываць меншую ролю, чым у сярэдневякоўі. Агульная колькасць графіці, дзе ўзгадваюцца сан, тытул, пасада або прафесія чалавека, складае ўсяго толькі 1,5 % ад агульнай колькасці надпісаў, знойдзеных у полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Калечыц, І. Л. Графіці XII–XVIII стст. з паўночна-ўсходняга слупа Спаса-Праабражэнскай царквы г. Полацка: праблемы вывучэння і інтэрпрэтацыі / І. Л. Калечыц // Беларуская даўніна. – 2014. – № 1. – С. 7–29.

2. Калечиц, И. Л. Экклезионим «Святой Спас» в граффити Полоцкой Спасо-Преображенской церкви / И. Л. Калечиц // Вопросы эпиграфики / Ун-т Дмитрия Пожарского; отв. ред. А. Г. Авдеев. – М., 2016. – Вып. 9. – С. 445–454.

3. Калечыц, І. Л. Эпіграфіка Беларусі X–XIV стст. / И. Л. Калечыц. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 271 с.

4. Калечиц, И. Л. Запись о наказании попа и другие граффити Спасо-Преображенской церкви г. Полоцка / И. Л. Калечиц // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. / Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2012. – Вып. 7. – С. 134–140.

5. Калечыц, І. Л. Імёны ў кірылічных надпісах XII – сярэдзіны XVI ст. на сценах Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку / І. Л. Калечыц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 11. – С. 14–18.

6. Калечиц, И. Л. Корпус граффити Полоцкой Спасо-Преображенской церкви: южная келья / І. Л. Калечиц. – Минск: БГПУ, 2020. – 247 с.

7. Калечыц, І. Л. Невядомыя ігуменні Спасаўскага манастыра (па матэрыялах графіці Полацкай Спасаўскай царквы) / І. Л. Калечыц // Образование и наука в Беларуси: актуальные проблемы и перспективы развития в XXI веке: сб. науч. ст. / Белорус. гос. пед. ун-т. – Минск, 2012. – С. 153–156.

8. Калечыц, І. «Злачынства» і «пакаранне» ў графіці Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы / І. Калечыц // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018. – № 6. – С. 11–15.

9. Калечиц, И. Л. Исторические личности в граффити Полоцкой Спасо-Преображенской церкви / И. Л. Калечиц // Гісторыя і археалогія Полацка і Полацкай зямлі: матэрыялы VI Міжнар. навук. канф. (1–3 лістап. 2012 г.): у 2 ч. / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік; [уклад. Т. У. Явіч]. – Полацк, 2013. – Ч. 2: Спасо-Преображенская церковь в Полоцке: История. Архитектура. Живопись. – С. 30–35.

10. Калечиц, И. Л. Запись о смерти Ульяны Тверской в граффито Полоцкой Спасо-Преображенской церкви / И. Л. Калечиц // Древняя Русь. Вопросы медиевистики. – 2013. – № 3 (53). – С. 60–61.

11. Калечиц, И. Л. Духовные лица средневекового Полоцка: неизвестные имена в граффити / И. Л. Калечиц // Гістарычна-археалагічны зборнік / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2014. – Вып. 29. – С. 85–90.

12. Калечиц, И. Л. Граффити полоцкого Спасо-Преображенского храма в «период переосвящения» (1656–1667 гг.) / И. Л. Калечиц // Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць: матэрыялы V Міжнар. навук. канф., 21–22 лістапада 2019 г.: да 390-годдзя Сімяона Полацкага / Нац. Полац. гіст.-культур. музей-запаведнік; [уклад. С. В. Гаўрылава]. – Полацк, 2019. – С. 193–200.

13. Калечиц, И. Л. Корпус граффити полоцкой Спасо-Преображенской церкви: северная келья / И. Л. Калечиц. – М.: Квадрига, 2023. – 204 с.

## References

1. Kalechyts I. L. Graffiti of the 12th–18th centuries from the half-ascent layer of the Transfiguration Church of the Savior in Polotsk: problems of study and interpretation. *Belaruskaya daunina* [Belarusian Antiquity], 2014, no. 1, pp. 7–29 (in Belarusian).

2. Kalechits I. L. The ecclesionym “Holy Savior” in the graffiti of the Polotsk Transfiguration Church. *Voprosy epigrafiki* [Questions of epigraphy]. Moscow, 2016, iss. 9, pp. 445–454 (in Russian).

3. Kalechyts I. L. *Epigraphy of Belarus X–XIV centuries*. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2011. 271 p. (in Belarusian).

4. Kalechits I. L. Record of the punishment of the priest and other graffiti of the Transfiguration Church of the Savior in Polotsk. *Krynitsaznaustva i spetsyyal’nyya gistarychnyya dystsypliny: navukovy zbornik* [Crimean knowledge and special historical disciplines: scientific collection]. Minsk, 2012, iss. 7, pp. 134–140 (in Russian).

5. Kalechyts I. L. Names in the Cyrillic inscriptions of the XII – Syaredzin of the XVI century on the stages of the Savior-Prabrazhenskaya Church in Polatsk. *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian Historical Journal], 2018, no. 11, pp. 14–18 (in Belarusian).

6. Kalechits I. L. *Corpus of graffiti of the Polotsk Transfiguration Church: southern cell*. Minsk, Belarusian State Pedagogical University, 2020. 247 p. (in Russian).

7. Kalechyts I. L. The Invisible Abbess of the Savior Monastery (based on the materials of the Count of the Polatsk Savior Church). *Obrazovanie i nauka v Belarusi: aktual’nye problemy i perspektivy razvitiya v XXI veke: sbornik nauchnykh statei* [Education and science in Belarus: current problems and development prospects in the 21st century: collection of scientific articles]. Minsk, 2012, pp. 153–156 (in Belarusian).

8. Kalechyts I. “Gloriousness” and “package” and the count of the Polatsk Savior-Pre-Abrazhenskaya Church. *Belaruski gistarychny chasopis* [Belarusian Historical Journal], 2018, no. 6, pp. 11–15 (in Belarusian).

9. Kalechits I. L. Historical figures in the graffiti of the Polotsk Transfiguration Church. *Gistoryya i arkhealogiya Polatska i Polatskai zyamli: materyyaly VI Mizhnarodnai navukovai kanferentsyi (1–3 listapada 2012 g.). Ch. 2. Spaso-Preobrazhenskaya*

*tserkov' v Polotske: Istoriya. Arkhitektura. Zhivopis'* [History and archeology of Polotsk and the Polotsk land: proceedings of the VI International scientific conference (November 1–3, 2012). Part 2. Transfiguration Church in Polotsk: History. Architecture. Painting]. Polotsk, 2013, pp. 30–35 (in Russian).

10. Kalechits I. L. Record of the death of Ulyana of Tver in the graffito of the Polotsk Transfiguration Church. *Drevnyaya Rus'. Voprosy medievistiki = Old Russia. The Questions of Middle Ages*, 2013, no. 3 (53), pp. 60–61 (in Russian).

11. Kalechyts I. Clerics of medieval Polotsk: unknown names in graffiti. *Gistarychna-arkhealagichny zborni*k [Historical and Archaeological Collection]. Minsk, 2014, iss. 29, pp. 85–90 (in Russian).

12. Kalechits I. L. Graffiti of the Polotsk Transfiguration Church during the "period of re-consecration" (1656–1667). *Simyaon Polatski: svetapoglyad, gramadska-palitychnaya i litaraturnaya dzeinasts': materyyaly V Mizhnarodnai navukovai kanferentsyi, 21–22 listapada 2019 g.: da 390-goddzya Simyaona Polatskaga* [Simeon of Polotsk: worldview, socio-political and literary activities: materials of the V International Scientific Conference, November 21–22, 2019: to the 390th anniversary of Simeon of Polotsk]. Polotsk, 2019, pp. 193–200 (in Russian).

13. Kalechits I. L. *Graffiti corpus of the Polotsk Transfiguration Church: northern cell*. Moscow, Kvadriga Publ., 2023. 204 p. (in Russian).

## Информация об авторе

**Калечиц Инна Леонидовна** – кандидат исторических наук, доцент, ведущий научный сотрудник. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: issnaudas@mail.ru

## Information about the author

**Inna L. Kalechits** – Ph. D. (Hist.), Associate Professor, Leading Scientific Researcher. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Akademicheskaya Str., Minsk 220072, Belarus). E-mail: issnaudas@mail.ru